Цана асобнага нумару 20 грошаў.

Opłatę pocztową uiszczono ryczałtem.

НАША ПРАЎДА

Выходзіць два разы у тыдзень.

Адрэс Рэдакцыі [illegible]:
Вільня, Віленская вул. [illegible] (Wileńska 12. m. 6)
Рэдакцыя адчынена ад 12 да 2 гадз. штодня,
акрача сьвяточных дзён. Адміністр. ад 9 да 3.

[illegible] месяц з дастаўкай да хаты
[illegible] заграніцы ўдвая даражэй.
[illegible] адрэса 30 гр.

Няпрынятыя ў друк рукапісы назад не
вяртаюцца.
Аплата надрукаванага залежыць ад Рэдакцыі.

Цана абвестак: перад тэкстам 25 грош.,
сярод тэксту 20 грошы і на 4 стр. 15 гр.
за радок петыту ў 1 шпальту.

№ 27 [illegible]льня, Серада 6-га ліпня 1927 г. Год I

„І нас разбудзілі“..

З кожным днём надыходзяць усё новыя і новая весткі аб ходзе выбараў у гмінныя самаўрады, — і з кожным днём робіцца ясьней, якую вялікую перамогу атрымалі беларускія працоўныя масы на гэтых выбарах. Нейкае паняцьце аб гэтым дае ўжо тая жменя карэспандэнцыяў аб выбарнай кампаніі, якія зьмяшчаем у сягоньняшнім нумары.

Вёска запраўды-ж з поўным правам можа пяяць свой нацыянальны гімн, які пачынаецца славамі: „І нас разбудзілі“... Разбудзілі яе тыя нялічаныя *крыўды*, якія яна дазнавала ў працягу цэлага раду гадоў, і той вялізарны *масавы арганізацыйны высілак*, які быў зроблены пад сялянска-работніцкім сьцягам. І хаця — па рэцэпту пасла Ярэміча — галовы руху былі зьбіты, — аднак, рух народны не замёр: ход выбараў і вынікі іх ясна паказуюць, што раз узварушаная маса з вялізарным імпэтам ідзе наперад далей, веручы ў свае ўласныя сілы і сваімі рукамі будуючы сваю лепшую будучыну.

Унікніце ў зьмест хаця-бы паданых ніжэй карэспандэнцыяў і справаздач аб выбарах, і вы ўбачыце ў іх яркі адбітак і гэтага імкненьня, і гэтае веры. Бо ўсе-ж яны пісаны рукой сялян, усе адбіваюць настрой масы.

Багаты плён зьбіраем мы з таго ідэйнага пасеву, які адбываўся за апошнія гады. Ён будзе відаць асабліва з таго мамэнту, калі нававыбраныя самаўрады распачнуць сваю работу.

Бо-ж, як нас інфармуюць з розных бакоў, сяляне з поўнай сьвядомасьцяй выбіралі ўсюды людзей, якія былі б *здольныя да вялікае і важнае самаўрадавае працы*. Вёска дала сваіх *найлепшых людзей*, разумеючы, што ад гэтага залежыць яе быт, здаваленьне яе найбольш пільных і неабходных патрэбаў.

Да нас даходзяць весткі з Наваградчыны аб правакацыйных патугах здраднікаў нашага народу, якія, хоць і вялі й вядуць непрымірымую барацьбу з сялянска-работніцкім рухам, але ў часе выбарнае кампаніі, ня маючы надзеі правясьці сваіх аднадумцаў, агітавалі сярод былых грамадаўцаў, каб выбіралі такіх радных, якіх-бы ўрад меў падставу пасьля *разганяць*. „Калі ўрад паразганяе самаўрады, дык-жа ўзрасьце рэвалюцыйны настрой у вёсцы“! — крывадушна казаў той тамы пан пасол, які спэкулюе на разгроме Грамады і спадзяецца, што здолее рабіць гэтае-ж і ў выпадку разгрому самаўрадаў. Але сяляне — як былыя грамадаўцы, так і другія, — раскумякалі, у чым тут справа, і адкідалі рашуча „добрыя рады“, выбіраючы людзей ня дзеля разгону, а дзеля *творчае працы* ў самаўрадах.

У жыцьці вёскі Заходняе Беларусі распачынаецца новая эра: эра іменна гэтае творчае працы. Разбуджаная і з'арганізаваная вёска цяпер прыступае да *выкарыстаньня на дзеле* гэнае свае сьвядомасьці і арганізаванасьці. Раней ці пазьней мы прыжджэм часоў, калі ўсё сваё жыцьцё працоўныя будуць тварыць і кіраваць ім — *самі*. Самаўрады — гэта школа, у якой мы мусім *узгадаваць будучых тварцоў і кіраўнікоў нашага жыцьця*.

Як адбываліся выбары самаураду.

Котранская гм., Пружанскага пав.

Нарэшце адбыліся доўга чаканыя выбары ў гмінны самаўрад у Котранскай гміне.

Першыя выбары сяброў гміннага сабраньня былі назначаны на 13-га чэрвеня, але з прычыны няяўкі значнай лічбы выбаршчыкаў (другі дзень Тройцы), адложаны на 21 чэрвеня, а выбары да рады гміннай раптоўна назначаны на 24-га чэрвеня. Дружнае выступленьне як на адных, так і на другіх выбарах сьвядомага сялянства вельмі азадачыла нашых паноў з „вялікага абозу“. Так, пасьля выбараў дэлегатаў 22-га чэрвеня „стары“ войт (запраўды-ж стары, бо служыць сёмы год) Мікалай Карнейчук вельмі брыдка лаяўся, пагражаючы, што такіх дэлегатаў ён ня прызнае, бо сюды папалі былыя „грамадзісты“ навет разам з „камітэтамі“, а вось яго прыяцелі былі дружна адкінены, таксама адкінены ўсе падлізы панскія і кар'ерысты, што шукаюць нажывы.

А вось, як адбыліся выбары радных 24-га чэрвеня:

Выбаршчыкі, сабраўшыся і ўгледзіўшы, што ўсе „свае людзі“, пастанавілі зрабіць адзін сьпісак, што і ўчынілі, запісаўшы 15 чалавек. Пры ўкладаньні сьпіска паўстала спрэчка, і нязначная частка аддзялілася, зрабіўшы асобны сьпісак з трох кандыдатаў, але на прапазыку гміннага інспэктара і па ўзаемнай згодзе падаўцоў гэных сьпіскаў яны былі злучаны ў адзін. Раптоўна быў апублікаваны другі сьпісак ад „ужэнду“ гміннага, у якім былі выстаўлены ўсе нашы „дабрадзеі“: абшарнікі, асаднікі, вясковыя кулакі і падпанкі і г. д. Дык былі ў нас два сьпіскі на выбар: абшарніцкі сьпісак быў № 1, а сялянскі № 2. Пры падлічаньні галасоў аказалася, што за сьпісак № 1 быў пададзены толькі адзін голас, а за сьпісак № 2 падалі 103 галасы, а 2 былі пустыя. Дзеля гэтага сьпісак № 1 быў правалены, а сьпісак № 2 ўвесь цалком прайшоў у раду (11 радных і 4 кандыдаты). У гэным сьпіску выключна сьвядомыя беларусы за выняткам двох — трох.

Гэткія выбары зрабілі ўражаньне на ўсю гміну: яны на практыцы паказваюць, што ў еднасьці сіла, што перамога працоўных ужо недалёка!

Чэсьць Вам, выбаршчыкі Котранскай гміны, што ўсе, як адзін, падалі свой голас за лепшых сыноў нашае Бацькаўшчыны! Няхай за гэтым прыкладам ідуць другія гміны!

„Выбаршчык“.

Настравіцкая гм., Слонімскага пав.

19.VI с. г. адбыліся ў нас выбары радных у гмінны самаўрад. Фігуравалі 4 кандыдацкія сьпіскі, з якіх тры першыя панскія, а чацьвёрты сьпісак — сьвядомых беларусаў сялян.

Выбраны дванаццаць радных; з гэтага ліку 8 сьвядомых беларусаў сялян, 3 несьвядомыя, 1 паляк — мельнік. Да галасаваньня на сто дваццаць выбаршчыкаў зьявілася сто адзінаццаць; чатырнццацёх пазбавілі права голасу, дык галасавала 97. Два сьпіскі ўняважнены. Атрымалі галасоў: № 1 — шэсьць, № 2 -- дзевяць, № 3 — дзевяць, сьпісак сьвядомых беларусаў сялян № 4 — семдзесят адзін голас.

Пазбаўлены голасу былі: суджаны, але не пазбаўлены правоў судам; быўшыя пад сьледзтвам; замечаныя паліцыяю ў палітычнай дзейнасьці, а таксама хто быў караны ці штрафаваны за падаткі ці за што іншае. Дзякуючы гэткаму масаваму пазбаўленьню голасу сьвядомейшых нашых сялян, з якіх большасьць была пастаўлена кандыдатамі нашага сьпіску, прышлося пісаць другі сьпісак, які і стаў пад № 4.

З гэтага бачым, што сьвядомасьць нашага сялянства расьце, бо, як на выбарах у абводах, так і ў гміне, сяляне аб'яднаўшыся пашлі са сьпіскам, выстаўленым сьвядомымі нашымі грамадзянамі, за выняткам жменькі панскіх паслугачоў і палякоў (цывільных асаднікаў), якія правялі ў выбаршчыкі прэзэса абвадовага камітэту п. Жукоўскага, ды ён па панскім сьпіску і прайшоў у радныя. Гэты самы Жукоўскі быў суджаны за падпал млына, у якім сядзеў раней жыд, які арандаваў яго. Але яго ня толькі не пазбавілі голасу, але даверылі кіраваньне абвадовым сходам, дзе сам ён пазбаўляў голасу суджаных і падазроных у палітыцы. Дык вось, як бачым, хто за ім ідзе.

М. С.

Ражанская гм., Касаўскага пав.

Нарэшце дачакаліся мы перавыбараў гмінае рады нашай гміны, каторая існавала ад нарадзінаў Польшчы. Сяляне добра зразумелі, якое значэньне мае гмінны самаўрад і якіх трэба правясьці людзей, каб справядліва вялася гмінная гаспадарка, а перадусім, каб выбарныя баранілі сялянскія інтарэсы. Ня спалі і ўсе паны ды паўпанкі. Ведалі дужа добра, што сялянства зробе належныя крокі, каб вырваць самаўрадаваньне з рук здраднікаў і панскіх падліз. І вось, як павялі ў нас выбары.

Дзень выбараў па абводах быў абвешчаны ўсяго за адзін дзень перад гэнымі выбарамі, — і да гэтага часу аб перавыбарах рады ніхто ня чуў. Але ў цяперашні час вельмі трудна ашукаць народ. Варожыя сілы сталі агітаваць, каб не выбіралі на дэлегатаў тых, хто быў у „Грамадзе“, бо ўсё роўна іх не прапусьціць улада. Але амаль-што ня ўсе абводы, як адзін (гміна была падзелена больш як на 20 абв.) выбралі на дэлегатаў найбольш сьвядомых грамадзян.

Як трэба было спадзявацца, не абыйшлося бяз рэпрэсій. Шмат у якіх абводах зажаданы былі перавыбары некатарых дэлегатаў, матывуючы тым, што быццам яны знаходзяцца пад судовым сьледзтвам (якога з іх ніхто сам і ня ведае!), дык згодна з § 11 распарадж. каміс. Зем. Усход. Асмалоўскага аб выбарах да гм. рад гэткія людзі выбіраны быць ня могуць ды навет права голасу ня маюць; на паўторных перавыбарах паліцыя не дала ім навет быць прысутнымі на сабраньні. Але ўсёж такі, як гавораць, усіх не „перашчупалі“, а знайшліся сьвядомыя, каторыя пад час выбараў радных правялі акцыю, як трэба.

Трэба адзначыць, што з усіх абводаў толькі два абводы дрэнна спраўляліся: Палянскі, дзе выбралі на дэлегата вайсковага асадніка п. Рапацкага (ён і вучыцель у іх вёсцы і быў старшынёю Гм. Выбар. К-ту), і Астроўскі абвод, каторы выбраў абшарніка ахв. Сямашку, і гэты астатні, як кажуць, сам упрасіўся, бо быў старшынёй абвадовага К-ту ў Астроўку і вельмі ўжо даўно жане аскому на войта.

Выбары па абводах адбыліся 5-га чэрвеня, выбары радных — 14 га чэрвеня. Пад час выбараў радных прымаліся ўсе спосабы дзеля разьбіцьця аднаітых настрояў у сялян-дэлегатаў. Галасавалі на сьпіскі. Сьпісак № 1 выставілі супольна абшарнікі і асаднікі, прыпісаўшы колькі сялян у кандыдаты дзеля заманкі галасоў, і падпісалі лёзунг „хто хоча, каб былі меншыя падаткі, галасуйце за сьпісак № 1“. Сяляне, убачыўшы гэта, пачалі сьмяяцца, ды зараз-жа выставілі свой сьпісак № 2. Тады паны, убачыўшы, што іх сьпісак з гэтакай кандыдатурай праваліцца, узялі ды сарвалі яго. Адзін ягомасьць, былы паліцыянт, цывільны асаднік з хутара Міхаліна, робіць сьпісак № 3, каторы чуць ня усіх тых ставіць у кандыдаты, што былі на № 1. Па галасаваньні вынікі наступныя: сялянскі сьпісак № 2 атрымаў з агульнага ліку 110 — 73 галасы, даючы 8 мандатаў! Сьпісак абшарніцка-асадніцкі — 16 гал. 2 мандаты, у тым 1 асаднік, п. Рапацкі, а другі — селянін-беларус, солтыс, ліста 4 атрымала 6 гал. — 1 мандат селянін-беларус, 5 ліста — 6 гал. — 1 канд. кола жыдоўскага.

Гэткім чынам маем 10 радных беларусаў-сялян, 1 асаднік і адзін жыд. Значыцца ўсе тасаваныя рэпрэсіі перад выбарамі нічога не памаглі, і ўсе сялянскія ворагі атрымалі „адстаўку“.

Памятайце, браткі радныя, што зараз будуць выбары войта, яго заступніка і лаўніка, значыць увесь гмінны ўрад. Выбраць вы павінны найбольш сьвядомых спасярод сябе, каторыя не дадуцца ашукаць і каторыя шчыра і справядліва прыступяць да направы гміннае гаспадаркі, якую старыя „дабрадзеі“ зьвялі да нуля, ды шчыра дамагацімуцца і бараніцімуць сялянскія інтарэсы.

Шчасьлівага Вам часу, дарагія браткі, распачаць працу!

Дэлегат.

Гарадзіская гм., Баранавіцкага пав.

22 га чэрвеня 1927 году ў Гарадзіскай гміне, Баранавіцкага пав., адбыліся выбары ў мясцовую гмінную раду ў прысутнасьці старасты й яго інспэктара. Усе сябры гміннага сабраньня, у якіх перад выбарамі было відаць нейкую трывожную задуманасьць, выяўлялі нявыразны ні то радасны, ні то сум-

Новыя арышты сярод Беларусаў.

2-га ліпня ў цэлым радзе польскіх газэт зьявілася аднолькавага зьместу апавяшчэньне пад сэнсацыйна-крыклівымі загалоўкамі — як-то: „Спаралiжаваньне камуністычных плянаў папсаваць віленскія ўрачыстасьні“, „Арышты сярод віленскіх камуністаў“ і г. д. Зьмест гэтага апавяшчэньня такі:

„У мінулую ноч улады бясьпечнасьці зрабілі чысьленыя арышты сярод выдатных прадстаўнікоў беларусаў, якія гуртуюцца каля камуністычнае Грамады.

„У памяшчэньні рэдакцыі беларускага выдавецтва „Маланка“ заарыштаваны: Ян Маразовіч, Ігнат Дварчанін і Вінцэнт Грышкевіч. Аднача̀сна заарыштаваны рэдактар „Белар. Справы“ п. Шыла, ды Руткоўскі, Мэнка і Косьцевіч. Апошні звольнены.

„У 3 гадз. 30 мін. уначы заарыштаваны эсэр Мамонька, які нядаўна прыехаў з Коўны. Вынікі вобыску далі вельмі кампрамітуючы матар'ял. Паводле чутак, якія разыйшліся, арышты гэтыя маюць сувязь з праектаваным выступленьнем камуністаў у дзень каранацыйнае ўрачыстасьці і прыезду Прэзыдэнта Дзяржавы. Падробнасьці трымаюцца ў тайне“.

Мы ня ведаем, ці камуністы запраўды мелі якія-колечы праекты выступленьня на дзень 2-га ліпня. Мы ведаем адно толькі, што ніхто з пералічаных асобаў не зьяўляецца камуністам, ані ня гуртуецца каля Грамады, якая — ня існуе! Імёны ўсіх заарыштаваных асоб ведамы ўсяму гораду, дый краю, бадай выключна, як культурных дзеячоў (імя Руткоўскага рэдакцыі няведама зусім). Грам. Маразовіч — гэта галоўны працаўнік... гумарыстычнае „Маланкі“ і ўкладчык адрыўнога календара! Доктар філялёгіі Ігнат Дварчанін — сябра ўраду Беларускага Навуковага Таварыства і сэкрэтар Беларускага Выдавецкага Т-ва, заняты выключна выдавецкай працай, аўтар друкаванае цяпер вялікае літаратурнае хрыстаматыі, лектар у Т-ве Беларускае Школы па літэратуры. Грам. Грышкевіч, абсольвэнт Пражскага Унівэрсытэту, працаўнік Т-ва Беларускае Школы, хворы на сухоты; апошні час ён знаходзіцца ў цяжкім стане і да арышту жыў на вёсцы пад Вільняй (каля Пасьпешкі), лечучыся ад цяжкое хваробы. Грам. Шыла быў рэдактарам „Беларускае Справы“ ў... 1924 годзе, за газэтныя сіацьці прасядзеў у вастрозе 26 месяцаў, а пасьля выхаду стуль заняўся выключна арганізацыяй беларускае драматычнае дружыны... Мэнке — пражскі студэнт і лектар у Т-ве Бел. Шк. Косьцевіч — сябра рэдакцыі польскае часопісі „Беларускі Дзень“, выдаванае палякамі пабеларуску з палітычнымі мэтамі... А Мамонька — „эсэр“, які „нядаўна“ — толькі адзін год назад! — быў выпісаны з Прагі і прыехаў праз Коўну дзеля... змаганьня з існаваўшай тады Грамадой, ды нейкі час туляўся па кутох таго-ж „Белар. Дня“.

Да ўсіх гэтых асоб трэба далучыць жонку вучыцеля Віл. Бел. Гімназіі Сіняўскага, якая нічога з ніякай палітыкай супольнага ніколі ня мела і ня мае, ды якая так сама была ў ноч з 1-га на 2-ое ліпня заарыштавана, ды зараз звольнена. Тады „камуністычная“ фізіяномія заарыштаваных будзе ўжо зусім... „бяссрэчная“.

Калі арышт Мамонькі можам разглядаць, як жаданьне зрабіць яму рэкляму і вярнуць добрае палітычнае імя, дык арышту ўсіх іншых мы зразумець ня можам. Ці гэта нейкі зласьлівы жарт, ці жаданьне некага выслужыцца перад вышэйшай уладай, „ліквідуючы“ няістнуючыя „небясьпекі“ для галавы дзяржавы шляхам арыштаў бязьвінных людзей — беларускіх культурных дзеячоў?

У панядзелак, 4 ліпня, усе гэтыя „важныя праступнікі“ разам з „кампрамітуючымі матэрыяламі“ былі звольнены з-пад арышту. І гэта — найлепшы доказ таго, што мы тут маем дзела з гэтай другой камбінацыяй.

Хто чытае нашу газэту і не прысылае падпіскі, той ня спрыяе разьвіцьцю роднай беларускай прэсы.

БРАТЫ! Прысылайце падпісную плату, а хто задоўжыўся, выраўняйце свой доўг.

ны настрой. Але пасьля выбараў было другое: на тых-жа тварах была відаць ужо ясная радасьць, й бадзёры настрой. І ня дзіва: вынікі выбараў будзяць веру ў лепшае будучае.

Вынікі выбараў такія:

Агулам прымалі ўчасьце 105 сяброў гміннага сабраньня. Выстаўлены былі 4 кандыдацкія сьпіскі, на якія пададзена галасоў:

№ 1 атрымаў 14 галасоў — 2 мандаты. № 2 — 76 галас. — 8 мандат. № 3 — 4 галасы, праваліўся. № 4—10 галас.—1 мандат.

Гэткім парадкам у радныя папалі: 2 паны польскай нацыянальнасьці, 8 сьвядомых беларусаў і 1 жыд. Разам 11 радных.

Стораж.

Мірская гм., Стаўпецкага пав.

23-га чэрвеня сёлета былі выбары гміннае рады ў Мірскай гм., Стаўпецкага пав. Сабралась каля 140 выбаршчыкау, на 3/4 сяляне. Перад самым галасаваньнем урадавы дэлегат, інспэктар ад самаўрадаў Стаўпецкага пав., зазначыў, што ў дэмакратычнай Польшчы справядлівы самаўрад павінен складацца з усіх станаў грамадзянсава, падчырківаючы неабходнасьць у гміннай радзе прадстаўнікоў ад вялікай зямельнай уласнасьці, прамысловасьці і гандлю, вучыцельства й асадніцтва. Інспэктар гэты казаў, што выбары павінны адбыцца свабодна, бяз „рэпрэсыі згары“, але ён згары аддзяліў 5 мандатаў ад агульнага ліку 15 для запрапанаваных ім „прадстаўнікоў“ і запрапанаваў галасаваньне па выбарных абводах. Сяляне моўчкі згадзіліся, думаючы, што ад кожнага выбарнага абводу, якіх у Мірскай гміне было 15, яны будуць мець па 1 дэлегату ў гмінную раду. Калі ж прышлося да галасаваньня, дык ясна стала, што сяляне ашукаліся, бо ім камісія па правядзеньні выбараў пазволіла паслаць у гмінную раду аднаго дэлегата ад 2—3 выбарных абводаў, ня лічучы тых 5 мандатаў, якія былі „забраніраваны“ для „прадстаўнікоў станаў“. Сялянам такім чынам, дасталося 10 мандатаў, дый то ня ўсе прыпалі шчырым абаронцам іхніх інтарэсаў. За тое-ж у Мірскую гмінную раду прайшлі: прадстаўнік ад маёнткаў князя Сьвятаполк Мірскага — галоўна кіраўнічы Царук, два прамыслоўцы й гандляры — хоць жыхары Мірскае гміны амаль-што ня ўсе земляробы, вучыцель Федаркевіч—вядомы сябра камісіі па пастаноўцы памятнікаў Касьцюшцы й Траўгуту і — прадстаўнік ад асадніцтва, хоць яго ў Мірскай гміне меней, чымся выбаршчыкаў у якім-колечы абводзе.

Расходзячыся, сяляне гаварылі паміж сабою, што ўжо ў наступны раз не ашукаюцца. Добра-ж было-б! Але пакуль сонца ўзыйдзе, то раса вочы выесьць, кажа народная прыказка.

Цікава адзначыць, што ў якасьці выбаршчыкаў гміннае рады ад пэўных колаў былі: сьвяшчэньнік Сьвірскі і ксёндз Мацкевіч, а на выбарах быў прысутным сам Стаўпецкі староста, які падчыркнуў сваю справядлівасьць і пажадзў, каб у наступны раз у гміннай радзе была й кабета „рэпрэзэнтантка другое палавіны чалавецтва“.

Быўшы шляхціц.

Разгром арміі Чанг-Тсо-Ліна.

Вялікае паражэньне Чанг-Тсо-Ліна.

Лёнданскія газеты даносяць аб новым страшэнным паражэньні паўночных арміяў у Кітаі.

Паўдзённыя арміі ўзялі важнае места Ганг Гуанг.

Чанг-Кай-Шэк, б'ючы Чанг-Тсо-Ліна, адначасна вядзе страшэнную барацьбу проці кітайскага камунізму; кітайскіх камуністаў расстрэлівае, расейцаў высылае з заваяваных тэрыторыяў.

З Пэкіну даносяць, што, пасьля страшэнна-крывавага бою арміяў абодвух Чангаў (—паўдзённага і паўночнага) між ракамі Жоўтай ды Галубой, паўдзённая армія прарвала фронт паўночнай (Чанг-Тсо-Ліна). Чанг-Кай-Шэк зараз-жа выкарыстаў прарыў, адрэзаўшы зусім адну палову арміі Чанг-Тсо-Ліна ад другой, ды заняўшы важныя стратэгічныя пункты. Пры гэтым пэкінская інфармацыя дадае, што ў гэтым рашучым бai прымалі ўчасьце ўжо галоўныя сілы Чанг-Тсо-Ліна...

З Шанхаю даносяць, што паўночныя арміі—пасьля паражэньня—папросту ўцякаюць у паніцы, куды папала. У местах на шляху гэтых панічных уцёкаў выбухае рэвалюцыя. У зьвязку з гэтым разгромам Чанг-Тсо-Ліна ўсе папяровыя кітайскія грошы страцілі на біржы каля паловы вартасьці...

Дзіва, што Японія заварушылася, а Англія ўвайшла з ёй у ваенны саюз!..

„Мацарствовая думка“ Польшчы.

У Львове польскай студэнцкай арганізацыяй — на чале з п. Раймундам... Пілсудскім—выдаецца часопісь, якая мае пышны назоў—„Моцарствовая Мысьль“. У адным з апошнім нумяроў часопісі надрукавана запраўды ж сэнсацыйная стацьця нейкага п. Бохэнскага — аб „Імпэрыялізьме нацыяналістычным і імпэрыялізьме дзяржаўным“ Польшчы. Артыкул п. Бохэнскага з такім захопленьнем перадрукавала віленская газэта „Слово“, орган міністраў Мэйштовіча і Незабытоўскага, што гэта неяк робіць з артыкулу ў часопісі львоўскай студэнцкай моладзі ўжо нешта вельмі і вельмі — ну, калі не паважнае, дык прынамся сэнсацыйнае...

Што ж піша гэты п. Бохэнскі?

Зьбіўшы зусім запраўды-ж дурную эндэцкую дзяржаўную думку аб тэй „нацыянальнай польскай дзяржаве“, у якой з часам—шляхам вострай нацыяналістычнай палітыкі—усе меншасьці будуць „перароблены на палякоў“, аўтар—замест гэтага блуднага „нацыяналістычнага імпэрыялізму“ Польшчы —падае думку аб запраўдным „дзяржаўным імпэрыялізьме“, які адзін ня толькі здолее адратаваць Польшчу ад „заглады“ паміж магутнымі суседзямі — СССР і Нямеччынай, але і даць ёй вялікую гістарычную місію і ролю“ ў сьвеце, а перадусім—на Усходзе.

Польшча стаіць цяпер з сваімі 30-міліёнамі „палякоў“ (з іх палякоў толькі каля 60 прац., як лічыць навет польская статыстыка... Рэд.) паміж 60-мільённай Нямеччынай і 100-мільённай Расеяй (дзесьці падзелася яшчэ 30 мільёнаў?! Рэд.). Датаго-ж суседзкія пачуцьці гэтых дзяржаваў да Польшчы—вельмі добра ведамыя: Нямеччына хоча вярнуць сабе адабраныя ад яе сілай саюзьнікаў заходнія землі, якія лічыць сваімі; СССР мае, з свайго боку, для рэшты Польшчы ўжо гатовы ўрад з п. Домбалем, ці можа тав. Менжыньскім—на чале... Дык ясна, што за ўсялякую цану трэба ратавацца ад безнадзейнага палажэньня нейкім, як кажуць варшавякі, „кавалам“...

Вось маладому аўтару маладой часопісі і „кінулася папросту ў вочы“ магчымасьць ратунку. — Справа ў тым, што на польскае шчасьце гэтая „Расея“ ня ёсьць нешта адзінае ды адналітае, але гэта якраз Саюз, ды прыгэтым—саюз галоўным чынам трох найвялікшых народаў: вялікаросаў (маскоўцаў), украінцаў і беларусаў...

Не разумееце яшчэ, у чым „кавал“?! Дык тады трэба ўжо зусім выложыць лапатай на стол тую геніяльную думку, якую (—божыцца аўтар) прыдумала сама зусім самастойна яго маладая, але даючая вялікія надзеі, галава.

Трэба — разьбіць гэты Саюз.

Калі ўся вялікадзяржаўная сіла СССР якраз у гэтым **Саюзе**, дык ясна, што, разьбіўшы гэты саюз, адным махам скасуецца ўся дзяржаўная сіла СССР, ці Расейскай Дзяржавы, замест якое на Усходзе Эўропы вялікай дзяржавай станецца **Польшча...**

Бачыце, як проста?—Бо-ж усё запраўды геніяльнае—заўсёды простае...

Перадусім Польшчы трэба выбраць з двух ворагаў аднаго. Дасьлед Вялікай Вайны паказаў, што забіць ці аслабіць Нямеччыну — немагчыма; дык трэба ўсе высілкі зьвярнуць—на Усход. Вось перад Польшчай і стаіць—нязвычайна простая палітычная задача: трэба прыцягнуць да сябе, на свой бок, **украінцаў ды беларусаў**, а тады—сьмела ісьці паходам на „Расею“... Тады ўжо стварэньне „Вялікай Ягелонскай Дзяржавы — ад Адэсы і Харкава да Коўны і Клайпэды“ будзе толькі пытаньнем часу...

Можа гэтая вялізарнага маштабу „місія“ ці спроба і ня ўдасцца... Можа; але—**ясна-ж, што лепш трэба спрабаваць**, чым чакаць бясчынна пагібелі...

Украінцаў і беларусаў трэба прыцягнуць на бок Польшчы — проці Расеі — зусім ня гвалтам і палянізацыяй, як хочуць дурныя эндэкі. Барані Божа! Дзякуй богу, Польшча з эндэцкіх памылкаў ды грахоў навучалася ўжо добра — новага дзяржаўнага розуму... Трэба прыцягнуць „крэсавыя народы“ — выключна **сілай ды хараством польскай культуры**, якая непараўнальна вышэйшая за расейскую,— прыцянуць іх поўным раўнапраўем („роўныя з роўнымі, вольныя з вольнымі“), робіць пекную, „сьвежую“ цытату з Міцкевіча малады аўтар, пэўна сам самастойна вышукаўшы яе ў „юбілейным выданьні“ паэты. **Беларусы і ўкраінцы павінны зразумець уласны інтэрас, які лічыць іх з Польшчай — проці Расеі...** Калі зразумеюць, тады „маральным“ выражэньнем гэтага агульнага паразуменьня дый дзяржаўнай спайкі ўсіх трох народаў зьявіцца— **Супольная манархія з польскай дынастыяй на чале...**

Аўтар артыкулу не сумляваецца ачі на хвіліну, што ўкраінцы і беларусы зразумеюць, што ніхто ў сьвеце не ахавае, не абароніць, не забясьпечыць так добра, поўна, шчыра, усебакова, па-хрысьціянску ўсіх бяз вынятку правоў і інтарэсаў гэтых народаў, як „супольная дынастыя“, ці прасьцей: польскія каралі... „Новая польская палітыка“, „ужо распачалася на нашых вачох“, як „палітычны паедынак (дуэль) між Польшчай і Расеяй—аб тое, хто з іх здолее прыцягнуць да сябе гэтыя народы“... Першым крокам у гэтай палітыцы аўтар лічa стварэньне „супольнае дынастыі“, ці—прасьцей — Польскае Манархіі. У гэтым будзе—першая „маральная спайка“... „Далейшая спайка (ўнутры манархіі) будзе залежаць ад таго, насколькі мы (палякі) здолеем канкураваць з расейскай культурай“. А гэтая культурная „спайка“ будзе, як трэба думаць з ясных слоў аўтара, зьмяшчацца ў тым, што з беларусаў і украінцаў будуць выганяцца „ўплывы расейскай культуры“—уплывамі польскай...

Вось, трэба дагадацца, тады можа й запраўды паклічуць вас, паны эндэкі, да працы... А цяпер—ня суньцеся, дурныя, не ў свае справы, ня рыпайцеся, няўдалыя, — сядзіце сабе ціха: у адпаведны час паклічуць вас, а то цяпер можаце толькі папсаваць ды змарнаваць „распачаты ўжо на нашых вачох палітычны паедынак“ паміж Польшчай і Расеяй — на „тэрэне“ беларускай і ўкраінскай душы... Дайце сьпярша тым, хто цяпер пакліканы Польшчай, споўніць сваю „гістарычную місію“...

Аўтар артыкулу, ня глядзячы на сваю маладасьць, прадбачыў ды адкідае згары ўсе закіды ды напады на сваю думку. „Ці-ж вы лічыце гэты плян разьбіцьця Расеі ды збудаваньня замест яе Вялікай Польшчы—фантазіяй, міражам“?.. Тады, дазвольце вам далажыць, ня меншы міраж, ня меншая фантазія—існаваньне ў працягу даўжэйшага часу тэй Польшчы, якая ёсьць цяпер, — кажа ён... Дык вось з двух „міражаў“, з дзьвюх „фантазіяў“ трэба выбраць папросту больш пекныя...

Так сільна, ясна, лягічна, пераконваюча піша орган львоўскай арганізацыі польскіх студэнтаў — на чале з п. Райм. Пілсудскім.

Віленскае „Слово“ двух п. п. міністраў ураду марш. Язэпа Пілсудскага, перадрукоўваючы артыкул, вітае асобу і думкі яго аўтара ў гэткіх сардэчных словах:

„Мы перадрукавалі артыкул п. Бохэнскага з мэтай шырокай прапаганды яго думак, такіх блізкіх нашай рэдакцыі. Маладой рэдакцыі часоп. „Мысьль Моцарствова“ і яе старшыні, п. Раймунду Пілсудскаму прыносім нашыя найсардэчнейшыя пажаданьні памыснага разьвіцьця сваіх думак у газэце — дзеля шчасьця Польшчы, дзеля велічы яе і дзяржаўнай будучыны“...

Мы пераказалі як мага карацей—сваімі словамі—даўжэнны артыкул „Моцарствовай Мысьлі“ п. Р. Пілсудскага. Ці трэба штосьці дадаваць да гэтай перадачы? Думаем, што ня трэба. І так усё ясна. Ясна асабліва — у сьвятле таго, што пішацца ў загранічнай прэсе аб розных вялікіх плянах—на бліжэйшую будучыну...

Можа толькі, як кур'ёз, дадамо, што, пішучы аб сваім новым геніяльным пляне— аб новай „дзяржаўна-імпэрыялістычнай“ палітыцы Польшчы, малады п. Пілсудскі (ці Бохэнскі) дагэтуль ня ведае, што прапанаваная ім „спроба“ ўжо была ня толькі выдумана, але і — зрэалізавана на практыцы значна старэйшым аднафамільцам ягоным. З якім пасьпехам, аб гэтым таксама казаць ня трэба...

Цікаўна можа толькі—ці сымвалічна? — саўпадзеньне гэтых прозьвішчаў...

Англійскі паход проці СССР.

Нямецкая прэса здабыла праз сваіх лёнданскіх карэспандэнтаў папросту сэнсацыйныя весткі—аб тых мерах ды стараньнях, якія робіць на ўсім сьвеце англійскі ўрад, каб стварыць—у тэй ці іншай форме—новую коаліцыю ды новую інтэрвэнцыю дзяржаваў проці СССР.

У той час, калі афіцыяльна паны міністры пярэчаць усім „чуткам“ аб арганізацыі процірадавага фронту, узапраўднасьці ідзе страшэнна энэргічная ўпорная ды спрытная праца над стварэньнем гэтага фронту. Ведама ж, Англія сама, калі-б навет і хацеў гэтага яе рэакцыйны ўрад, ня можа пачаць простай вайны з СССР, бо гэтага ня хоча англійская работніцкая кляса. Дык англійскі ўрад націскае на другія дзяржавы, мажучы ім губы рознымі салодкімі абяцанкамі, каб рыхтаваліся да вайны... А пакуль-што англійскі ўрад верыць у сілу таго эканамічнага байкоту, ці блёкады, якую ўжо распачаў проці Радаў — у паразуменьні з Амэрыкай. Англійскія рэакцыянэры вельмі здаволены хваробай Брыяна, без якога яны спадзяюцца хутка падбіць Пуанкарэ, каб сарваў зносіны з Радамі. Тады больш, як палова, фронту будзе гатова..

Нямецкія карэспандэнты даведаліся, што (—ў паразуменьні з Англіяй, а можа і за пазыку ад яе ж!) урад Даніі пачаў паглыбляць марскія праходы ў Зундзе, каб праз яго маглі прайсьці найвялікшыя караблі... англійскага флёту! На востраве Эзэлі быццам ужо будуецца вялізарная база для англійскага флёту.. У патрэбны мамэнт Англія здолее папхнуць на вайну з Радамі Польшчу Пілсудскага, які быццам толькі й лятуціць аб тым, каб „дарабіць недаробленую Вялікую Польшчу — ад мора да мора“

І. Эрэнбург.

13 люлек.

(Пераклаў М. Шыла).

Потым Луі ізноў будаваў дамы і няньчыў сына. Але скора настала вайна, і нягодныя прусакі аблажылі Парыж. Больш ніхто не хацеў будаваць дамоў, і рыштаваньні недаканчаных будынін пуставалі. Ядры прускіх гарматаў, падаючы, бурылі многа будынін прыгожага Парыжу, над якімі працавалі Луі-Ру і іншыя муляры. У Луі ня было працы, ня было хлеба, а трохгадовы Поль ужо ўмеў моўчкі, як каўка, рашчыняць свой рот. Тады Луі далі стрэльбу. Узяўшы яе, ён не пайшоў пяяць і крычаць „хлеба!“, але пачаў, як шмат тысячаў іншых муляроў, цесьляў і кавалёў, бараніць найпрыгажэйшы з усіх гарадоў — Парыж ад нягодных прусакоў. Маленькага Поля прытуліла добрая кабеціна, уласьніца крамы з зелянінай, пані Мано. Луі-Ру, разам з іншымі кашульнікамі, у зімовую сьцюжу, босы, на форце сьв. Вінцэнта падкачываў ядры да гарматы, і гармата страляла ў нягодных прусакоў. Ён доўгія дні нічога ня еў, бо ў Парыжы быў голад. Ён адмарозіў сабе ногі, бо ў зіму аблогі стаялі нябывалыя халады. Прускія ядры валіліся на форт сьв. Вінцэнта, і кашульнікаў рабілася ўсё менш, але Луі Ру не пакідаў свайго мейсца каля маленькае гарматы, бо ён бараніў Парыж. І найпрыгажэйшы з гарадоў варт быў такое абароны. Ня гледзячы на холад і сьцюжу, лунаті агні бульвараў італьянскага і капуцынаў, хапала рубінавых настоек дзеля франтаў і ня зыходзіла нядбайная ўсьмешка з жаночых твараў.

Луі Ру ведаў, што больш няма імпэратара і што цяпер у Парыжы Рэспубліка. Падкочываючы ядры да гарматы, ён ня мог задумацца над тым, што такое „рэспубліка“, але кашульнікі, што прыходзілі з Парыжу, казалі, што кавярні бульвараў, як і калісьці, поўныя франтаў і нядбайных кабет. Луі-Ру, слухаючы іх злоснае марматаньне, кеміў, што ў Парыжы нічога не зьмянілася, што „рэспубліка“ знаходзіцца не на вуліцы Чорнае Удавы, а на шырокіх праспэктах сямёхкоснае Зоркі і што, калі муляр адгоніць прусакоў, маленькі Поль ізноў будзе адчыняць свой рот. Луі-Ру ведаў гэта, але ён не пакідаў свайго мейсца ля гарматы, і прусакі не маглі ўвайсьці ў горад Парыж.

Але ў адну з раніц яму прыказалі пакінуць гармату і вярнуцца на вуліцу Чорнае Удавы. Людзі, якіх звалі „Рэспубліка“ і якія напэўна былі франтамі, або нядбайнымі кабетамі, пусьцілі нягодных прусакоў у прыгожы Парыж. З люлькай у зубах пануры Луі-Ру хадзіў па вуліцах прадмесьця сьв. Антона.

Прусакі прышлі і пашлі, але ніхто не будаваў дамоў. Поль, як каўка, рашчыняў свой рот, і Луі-Ру пачаў чысьціць стрэльбу. Тады на сьценах быў расклееня грозны загад, каб кашульнікі аддалі свае стрэльбы, бо франты і нядбайныя кабеты, якіх клікалі „Рэспублікай“, памяталі ліпнёвыя дні 48 га году.

Луі-Ру не хацеў аддаць свае стрэльбы, а разам з ім усе кашульнікі прадмесьця сьв. Антона і шмат іншых прадмесьцяў. Яны са стрэльбамі выйшлі на вуліцы і стралялі. Было гэта ў цёплы вечар, калі ў Парыжы чуць пачыналася вясна.

На наступны дзень Луі-Ру бачыў, як па вуліцах цягнуліся прыхарошаныя карэты, развалістыя каламашкі, балаголы і калёсы. На калёсах ляжала ўсялякае дабро, а ў карэтах сядзелі людзі, якіх Луі прызвычаіўся бачыць у кавярнях Вялікіх Бульвараў, або ў Булёнскім лесе. Тут былі маленькія генаралы ў малінавых кепках з грозна зьвісаючымі вусамі, маладыя кабеты ў шырокіх спадніцах, абложаных карункамі, азыдлыя аббаты ў фіалетавых сутанах, старыя франты ў бліскучых вароньніх, пясочных і рыжых цыліндрах, маладыя афіцэры, якія ніколі ня былі ні ў форце сьв. Вінцэнта, ні ў іншых фортах, важныя і лысыя лякаі, сабачкі з істужкамі на гладка прычасанай шаўкавістай шэрсьці і навет крыклівыя папугаі. Усе яны сьпяшаліся да Вэрсальскіх Варотаў. І калі вечарам Луі-Ру пайшоў ня пляц Опэры, ён пабачыў апусьцелыя кавярні, дзе франты ня пілі больш рубінавых настоек, і пазабіваныя крамы, каля якіх не сьмяяліся ўжо нядбайныя кабеты. Людзі з кварталаў Ялісейскіх Палёў, Отэйля і сьв. Жэрмэна, раззлаваныя кашульнікамі, што не хацелі аддаць сваіх стрэльбаў, пакінулі прыгожы Парыж, і навет аспідныя люстэркі хаднікоў не адбівалі пагасшых агнёў, ды маркотна чарнелі.

Луі-Ру ўбачыў, што „Рэспубліка“ паехала ў карэтах і на балаголах. Ён спытаўся ў іншых кашульнікаў, хто астаўся замест яе? Яму адказалі: „Парыская Камуна“. І Луі зразумеў, што Парыская Камуна жыве гдзесь недалёка ад вуліцы Чорнае Удавы.

Але франты і кабеты, што пакінулі Парыж, не хацелі забыцца аб найпрыгажэйшым з усіх гарадоў. Яны не хацелі аддаць яго мулярам, цесьлям і кавалям. І ізноў ядры гарматаў сталі руйнаваць дамы; цяпер іх пасылалі не нягодныя прусакі, а добрыя заўсягдатаі кавярняў — „Англійскай“ і іншых. І Луі зразумеў, што яму трэба вярнуцца на сваё старое мейсца ля форту сьв. Вінцэнта. Але ўласьніца крамы зелянiны, пані Мано, была ня толькі добрая кабета, а і добрая каталічка. Яна адмовілася пусьціць у свой дом сына аднаго з бязбожнікаў, што забілі парыжскага япіскапа. Тады Луі Ру ўзяў у зубы люльку, а свайго сына Поля на плечы і пайшоў да форту сьв. Вінцэнта. Ён падкочываў ядры да гарматы, а Поль забаўляўся побач пустымі патронамі. У начы хлопчык спаў у доме стоража вадакачкі пры форце сьв. Вінцэнта. Сторож падараваў Полю новенькую гліняную люльку акурат такую, якую курыў Луі-Ру, і кусочак мыла. Цяпер Поль, калі яму абрыдала слухаць стрэлы і глядзець на гармату, што плявала ядрамі, мог яшчэ пускаць мыльныя паўхіры. Паўхіры былі розных колераў—блакітныя, ружовыя і ліловыя. Яны былі падобны да балёнікаў, якія куплялі пекна апранутым хлопчыкам у Тюльерыйскім садзе франты і нядбайныя кабеты. Праўда, паўхіры сына кашульніка жылі адзін міг, а балёнікі дзяцей з кварталаў Ялісейскіх Палёў трымаліся цэлы дзень, крэпка прывязаныя, але і тыя і другія былі прыгожыя, але і тыя і другія хутка ўміралі. Пускаючы з глінянае люлькі мыльныя паўхіры, Поль забываўся рашчыняць свой рот і чакаць куска хлеба. Падыходзячы да людзей, якіх усе называлі „камунарамі“, і сярод якіх знаходзіўся Луі-Ру, ён важна сьціскаў у зубах пустую люльку, патураючы свайму бацьку. І людзі, на хвіліну забываючыся аб гармаце, ласкава гаварылі Полю:

— Ты праўдзівы камунар.

(глядзі ды параўнуй арт. Бохэнскага ў новай газэце студэнтаў-пілсудчыкаў у Кракаве!)...

Англійскія ўплывы—проці ССРР усе растуць у Балтыцкіх Дзяржавах, у Фінляндыі і Літве, у Румыніі і навет у Вэнгрыі... У самай Нямеччыне, ня кажучы ўжо аб іншых—каталіцкіх дзяржавах,—ёсьць значная група прыхільнікаў паходу на ССРР—проці яе бязбожнага ўраду; на чале яе стаіць ведамы мільянэр-прамысловец Арнольд Рэхбэрг.

Англійцы, як пішуць нямецкія карэспандэнты, добра ведаюць аб тым, што рыхтуецца проці англійскай улады ў Індыі і Афганістане, дзе не далей, як у наступным годзе, маюць выбухнуць вялізарныя паўстаньні, быццам падрыхтаваныя Масквой... Хаця ўсе меры англійцамі прыняты, але... ўсе-ж было-б добра, думаюць яны, каб да таго часу ўжо ўдалося ўдарыць па бальшавіках—асабліва яшчэ чужымі рукамі — ў Эўропе... І праца йдзе.

Так прынамся інфармуюць нямецкія газэты.

У справе урадавага тэрору у ССРР.

Пратэст англійскіх работнікаў.

Англійскія работніцкія пасля выслалі ў Маскву заклік да спыненьня далейшых масавых казьняў. Яны кажуць, што тасаваньне ўрадавага тэрору ў ССРР, паміж іншым, перашкаджае ў барацьбе з процірадавым курсам англійскай палітыкі.

Адказ Рыкава.

Радавае агенцтва „ТАСС“ даносіць:

У адказ на тэлеграфны пратэст павадыроў англійскіх работнікаў проці казьняў бяз суда, Рыков заявіў, што пастанова ГПУ аб расстрэле 20 белагвардзейцаў адбылася з прычыны высьвятленьня поўнай віноўнасьці абвінавачаных. Варожая да ССРР заграмічная прэса пашырае фальшывыя весткі. Гэтая кампанія прэсы зьвязана з агульнай барацьбой проці ССРР, якую вядуць заінтэрасаваныя колы, а перадусім англійскія кансэрватары—пры маральным і матэрыяльным падтрыманьні з боку англійскага ўраду.

Скаргі на расстрэлы бяз суда — беспадстаўныя. Згодна з законамі ССРР, ГПУ — у выпадках неабходнай барацьбы з актыўнымі контр-рэвалюцыйнымі выступленьнямі — паступае так, як у буржуазных дзяржавах паступаюць даразныя ды палявыя суды.

ССРР вельмі цэніць апінію работніцкай клясы Англіі, але задачай пралетарыяту, здавалася б, павінна было-б быць падтрыманьне адзінай у сьвеце работніцкай дзяржавы, якая бароніць свае інтарэсы ў вельмі цяжкіх варунках.

„Спадзяюся,—заявіў у канцы Рыков, — што шырокія колы англійскага грамадзянства ня пойдуць па сьлядох англійскага ўраду, які вядзе палітыку правакацыі і падрыхтоўвае вайну“.

Адозва Цэнтральнай Рады Прафэс. Саюзаў ССРР.

Цэнтральная Рада Праф. Саюзаў ССРР выпусьціла адозву да работнікаў ССРР і Англіі, у якой трэбуе, каб „Англійска-Радавы Камітэт“ падняў свой голас проці англійскай рэакцыі, якая рыхтуецца да вайны з ССРР. Цэнтральная Рада кажа, што Генаральная Рада Англійскіх Праф. Саюзаў сваім маўчаньнем возьме на сябе адказнасьць за палітыку сабатажу, якая разьбівае пралетарскае адзінства работнікаў ССРР і Англіі, — адзінства, якое выяўляе гэты Англійска-Расейскі Камітэт.

Новы Саюз Англіі з Японіяй.

Амэрыканскі ўрад і прэса страшэнна занепакоены новым паваротам англійскай палітыкі — у бок паразуменьня ці навет саюзу з Японіяй.

Як ведама, некалькі гадоў таму Англія сама сарвала даўгалетні саюз з Японіяй, які даваў такую сілу абедзьвюм дзяржавам у Азіі. Пад націскам Амэрыкі Англія адмовілася ўзнавіць гэты саюз з Японіяй, а замест Японіі выбрала Амэрыку. Цяпер Японія, не падтрымліваючы зусім Англіі ў Кітаі, пераканала Англію, што ўсе яе паражэньні ў Азіі вынікаюць з таго, што Англія страціла такога магутнага ў Азіі саюзьніка, як Японія... Дык вось, як даведалася амэрыканская прэса, у часе перагавораў аб „разбраеньні на моры“ (чытай: павялічэньні ды паляпшэньні збраеньняў 3 марскіх дзяржаваў — Амэрыкі, Англіі і Японіі), — Англія — за кулісамі канфэрэнцыі — ізноў паразумелася з Японіяй, дзеля чаго пачала рашуча падтрымліваць яе дамаганьні. Быццам, паразуменьне Англіі з Японіяй грунтуецца на гэткіх падставах:

1. Англія і Японія злучаюць сваю акцыю ў Кітаі, рашуча выступаюць разам проці ССРР, пасьля чаго — папросту дзеляць увесь Кітай на 2 паловы: паўночную, дзе будзе „трымаць дзьверы зачыненымі“ Японія, і паўдзённую — „англійскую“... Дзеля таго Японія рашуча падтрымае Чанг-Тто-Ліна, а Англія—Чанг-Кай-Шэка, спыніўшы паміж імі вайну...

2. За гэта Англія падтрымае дамаганьне Японіі адносна да роўнасьці аружных сілаў на моры...

3. З свайго боку Японія ня будзе пратэставаць проці будовы „вялікай марской базы“ для англійскага флёту ў Сінгапуры, а за гэта Англія з свайго боку падтрымае японскі пратэст проці праекту Амэрыкі збудаваць такую ж вялікую базу для свайго флёту на Гавайскіх астравох...

Калі гэта ўсё праўда (а што падобна да праўды, няма што казаць), дык ясна, да якога „разбраеньня на моры“ дагаварыліся 3 магутныя марскія „карсара“ — імпэрыялісты на канфэрэнцыі ў „мірнай Жэнэве“... Вынікі гэтага „разбраеньня“ — ясныя: Японія атрымае права на $^5/_6$ павялічыць свой флёт; злучаныя японска-англійскія сілы зробяць спробу ізноў задушыць кітайскі народ, зрабіўшы яго ізноў сваім прыганятым; Англія збудуе новую падставу для свайго панаваньня ў Азіі, каб „забясьпечыць“ перадусім гэтае панаваньне „на векі“ ў Індыі. А ў дадатку — прадстаўнік Амэрыкі на канфэрэнцыі ў Жэнэве (відаць—пад уражаньнем атрыманых вестак аб новым „саюзе“) толькі-што заявіў, што ён зьвярнуўся аб новыя інструкцыі да свайго ўраду... А гэты ўрад, як пішуць з Вашынгтону (сталіца Штатаў), мае зараз-жа выступіць з дэклярацыяй аб тым, што, калі на канфэрэнцыі ў Жэнэве Амэрыка не згаворыцца з Англіяй і Японіяй у справе „разбраеньня на моры“, тады амэрыканскі ўрад „апрацуе сваю новую праграму... будовы марскога флёту, кіруючыся выключна думкай аб сваей дзяржаўнаў бясьпечнасьці“... А гэта значыць, што Амэрыка ўсьцяж будзе будаваць новыя браняносцы... Дык канкурэнцыя ў збраеньнях з багатай Амэрыкай пачнецца ў нябывалым перад вайной тэмпе...

Ніколі не зьніштажай сваей беларускай газэты! Прачытаўшы, давай суседу, ці знаёмаму, каб і ён пазнаў праўду аб жыцьці свайго народу і даведаўся, што робіцца на сьвеце!

У Сойме.

Паседжаньне 30 чэрвеня.

Сойм—перад сьмерцяй — на-гвалт хоча вырабіць сабе „добрую апінію“, дый ня толькі сярод урадоўцаў, але і сярод больш шырокіх масаў выбаршчыкаў. — Апрача агульнай завостранай апазыцыйнасьці проці сучаснага ўраду, якая, ведама-ж, выклікае добры водгук у краі, Сойм хоча даць „народу“ і нешта пазытыўнае.—Такім чынам, Сойм — па прапазыцыі скарбовай камісіі—прыняў рэзалюцыю, каб Дзяржаўны Банк Краёвай Гаспадаркі ўсім дробным гаспадаром (нябольш 15 гэктараў), якія атрымалі пазыкі на адбудову зруйнаваных вайной гаспадарак, рабіў вялікія палёгкі ў сплаце гэтых пазыкаў. Даўгі гэтыя, паводле жаданьня Сойму, павінны быць скасаваны або на палову, або — для асабліва незаможных гаспадароў—навет цалком... Ведама-ж, гэта—не закон, але „рэзалюцыя“, дык—ці ўрад выдасьць адпаведны загад Банку, гэта яшчэ—пытаньне. Але „добрае ўражаньне“ ад добрага сэрца паміраючага Сойму ўсё-ж такі дзе ў каго мо' й астанецца, хаця перадусім падаставалі гэтыя пазыкі вызваленскія і пястоўскія агенты!...

Пасьля гэтага Сойм—па дакладу п. Лібэрмана — аднагаласна прыняў у другім чытаньні—проці—волі ўраду — закон аб дапамозе запасным, пакліканым на летнія „цьвічэньні“ (вучэньні, лагерны збор). Вайсковая камісія паразумелася з бюджэтнай, якая так сама ахвотна зрабіла ўсё, каб знайсьці патрэбныя на пакрыцьце выдаткаў на гэта — 3 мільёны з лішкам злотых. Мы ведаем ужо, што і гэта зроблена Соймам проці рашуча выражанага пратэсту ўраду (ваеннага міністэрства). Гэткім чынам тут, у гэтай справе, Сойм паказаў сябе навет больш клапатлівым аб вайсковых запасных, як сам марш. Пілсудскі...—Дый усё гэта—напярэдадні роспуску ды новых выбараў!

У канцы Сойм зрабіў яшчэ адзін удар па ўраду, пераслаўшы ў камісію прапазыцыю аб скасаваньні тэлефонавых лічнікаў, уведзеных міністрам пілсудчыкам Медзіньскім (Пошта і Тэлеграф), якому газэты закідаюць нейкія „ўмовы“ з таварыствам тэлефонаў аб „ахвярах“ на „выбарны фонд“ ураду—за гэтыя вельмі карысныя для таварыства (— коштам спажыўцоў!) „лічнікі“. Пасьля прачытана была вялізарная маса інтэрпэляцыяў...

Соймавая партыі рыхтуюцца да выбараў.

Адзін па адным соймавыя клюбы ўносяць прапазыцыі—аб паправе быту ці то вайсковых запасных, ці то дзяржаўных урадоўцаў, ці вучыцялёў. Асабліва стараецца „заскарбіць“ сабе прыхільнасьць выбаршчыкаў-урадоўцаў эндэцыя з „фальваркамі“. І толькі што, пазываючыся на заявы ўраду аб паправе фінансавага стану Польшчы, эндэцкія паслы ўнясьлі прапазыцыю аб прызнаньні назад усіх тых дадаткаў для вучыцялёў, якія скасаваны былі ў канцы 1925 г. Грабскім, што „ратаваў“ гэтым польскія фінансы...

Справа самаўрадавых законаў у камісіі.

Соймавая камісія 30 чэрвеня занялася ізноў справай самаўрадавых праектаў, якая цягнецца ад часу слаўнага ўраду „Хіена-Пяста“—ад 1923 г...

Характэрны даклад аб справе самаўрадаў у Польшчы ды аб пажаданым кірунку новага закону зрабіў эндэк Казлоўскі.

Перадусім эндэцыя страшэнна перастрашылася тымі рэзультатамі, якія даюць выбары ў самаўрады—мястовыя ды вясковыя — для „народовых партыяў“, дык дакладчык трэбуе ад камісіі, каб безадкладна патрэбавала ад ураду спыненьня выбараў—прынамся ў усходн. Галічыне—да прыняцьця новага закону Соймам.

Цікаўна, што страх перад небясьпекай зусім разьвязаў язык эндэцкаму паслу, які, пазываючыся на новую „польскую статыстыку“, ня толькі кажа, але папросту—крычыць праўду аб тым, што робіцца на мясцох у Галічыне дый на Беларусі. Ён кажа, што выбары паводле аўстрыяцкага самаўрадавага закону з дадаткамі, зробленымі ўрадам, аддадуць цалком — як месты, так сама вясковыя гміны—ў рукі няпольскага насяленьня. Палякі ня маюць большасьці ў местах, дык самаўрады возьмуць у свае рукі—згодна паразумеўшыяся — жыды з украінцамі; вясковыя самаўрады амаль не цалком пападуць у рукі ўкраінцаў. Гэты няўхільны рэзультат будзе яшчэ пагоршаны для польскага элемэнту—байкотам выбараў з боку ППС.

„У гэткіх варунках выбары раўняюцца поўнай ліквідацыі польскасьці ў усходняй Галічыне“... „Што-ж датычыць ваяводзтваў Валынскага, Палескага, Наваградскага і Віленскага, дык там неўпарадкаваны стан дзяржаўнай прыналежнасьці вялікай масы грамадзян—жыдоў і расейцаў (?!), а так сама ізноў узросшая ў апошнія часы камуністычная агітацыя, якое ўрад ня хоча ці ня можа спыніць,—трэбуе адкладу выбараў да лепшага часу“.

Дык п. Казлоўскі—ад імя эндэцыі — ў гэткім сэньсе і прапануе камісіі прыняць рэзалюцыю.

Ня гледзячы на пратэсты ППС, вызваленцаў ды ўсіх меншасьцяў, камісія большасьцю галасоў прыняла прапазыцыю эндэцыі.

Палітычная хроніка.

У Польшчы.

Пазыка для Польшчы адкладзена—на кастрычнік...

Газэты паведамілі, што на паседжаньні Фінансавай Рады міністар скарбу далажыў аб рэзультатах перагавораў у справе заграмічнай пазыкі для Польшчы. Быццам усе перагаворы закончаны памысна, узгоднены ўсе пункты. Не ўстаноўлены толькі спрэчны пункт аб курсе пазыкі, і дзеля таго падпісаньне ўсей умовы адкладаецца на кастрычнік...

Мы высьвятлялі ўжо біржавыя прычыны адкладу польскай пазыкі да лепшых часоў. Напомнім толькі, што на амэрыканскай біржы, на якую ўканцы пападаюць усе эўрапэйскія пазыковыя паперы, гэтыя паперы страшэнна спалі на курсе. Дзеля таго банкіры прапануюць Польшчы—або прыняць такі нізкі курс пазыкі, які-б згары пакрыў іх страты—згодна з „слабым настроем“ сусьветнай (чытай: амэрыканскай) біржы; або пачакаць, пакуль гэты слабы настрой не паправіцца. Але для Польшчы згадзіцца на далейшае паніжэньне і без таго страшэнна нізкага курсу ды наагул цяжкіх варункаў сваей пазыкі—гэта значыць страціць яшчэ некалькі дзясяткоў мільёнаў злотых з тэй сумы, якая будзе дадзена ў рукі яе ўраду. З другога боку, як мы пісалі няраз, Польшча чакаць больш ня можа: яе targовыя балянсы што-дня пагражаюць усё балей яе валюце... Дык вось, як пішуць газэты, ласкавыя банкіры згадзіліся пакуль-што даць Польшчы „залічку“ ў лік будучае пазыкі—ў разьмеры... 15 мільёнаў даляраў.—Ведама-ж, каб толькі падтрымаць пакуль-што яе валюту.

Жыдоўскі „жаргон“ у варшаўскай Радзе.

Удары па ўдарах сыплюцца на бедную галаву польскай эндэцыі... Толькі-што ў Варшаве новаабраная рада выбрала сабе за старшыню пэпэса — замест эндэка... Эндэк папаў толькі на становішча аднаго з чатырох віцэ-старшыняў — побач з сацыялістам і жыдом... А цяпер — гора ня меншае ды скандал — сусьветны: жыдоўскія паслы сацыялісты пачалі навет прамаўляць на паседжаньнях рады пажыдоўску... Гэта — у „чыста польскай“ Варшаве!!! „Першы раз за ўсе часы ў Варшаўскай мястовай радзе пачуўся жыдоўскі жаргон“, — зелянее са злосьці эндэцкая прэса...

Але і гэта яшчэ—ня ўсё. Маюць яшчэ адбыцца выбары ў Варшаўскі магістрат (Управу), дый тут, ня гледзячы на ўсе захады і пагрозы эндэцыі з яе фальваркамі, прэзыдэнтам места (галавой управы) ня будзе эндэк, але мае быць або пэпэсавец, або — „санатар“ — пілсудчык...

Заграніцай.

Даклад Чычэрына аб заграмічнай палітыцы ССРР.

Пасьля павароту ў Маскву Чычэрын зрабіў Радзе Народных Камісараў абшырны даклад аб сваей дзейнасьці ў часе пабыту ў Заходняй Эўропе. Рада Камісараў прыняла да ведама даклад, адобрыла кірунак працы Чычэрына і дала яму надалей шырокія паўнамоцтвы дзеля вядзеньня перагавораў з дзяржавамі Захаду. Палітыка ССРР ў Эўропе астанецца надалей нязьменнай.

Бэрлінскія крыніцы дадаюць, быццам мае быць зьменена палітыка Радаў на Далёкім Усходзе. — Быццам у Кітаі Рады маюць весьці больш умераную палітыку, пасоўваючыся да—збліжэньня з Японіяй...

Перагаворы ў справе судаходзтва па Дзьвіне.

У Леплі адбылося спатканьне пагранічных ўладаў польскіх і радавых — у справе паразуменьня аб узнаўленьні судаходзтва па рацэ Дзьвіне.

Манархічная змова ў Нямеччыне

Камуністычная газэта „Вэльт ам Абэнд“ публікуе сэнсацыйныя дакуманты, якія сьцьвярджаюць істнаваньне змовы, што мае на мэце манархічны пераварот у Нямеччыне. Цэнтрам замахоўцаў зьяўляецца палац у Дорне — у Галяндыі, дзе жыве Вільгэльм. Але „душой“ змовы зьяўляецца яго новая маладая жонка — Гэрміна, якой, відаць, хочацца пабыць хаця кароткі час запраўднай „нямецкай імпэратрыцай“, а ня толькі жонкай былага ды скіненага з пасады кайзэра. Газэта публікуе прыватныя пісьмы замахоўцаў, з якіх відаць, што замах меў ці мае адбыцца ў вельмі хуткім часе. Пісьмы гэтыя пералічаюць павадыроў змовы дый цэлы рад вышэйшых урадоўцаў паліцыі і іншых установ ў, замешаных у справу. Грошы на працу далі прырэйнскія прамыслоўцы.

Калі праўда ўсё, дык цікаўна! А яшчэ толькі-што сам „рэспубліканец“ Штрэзэман заявіў у сваей „нобэлеўскай прамове“ ў сталіцы Нарвэгіі, што Нямецкі народ ня можа адмовіцца ад свайго мінулага дый ад удзячнасьці для павадыроў імпэратарскай Германіі, якая была і назаўсёды астанецца для немцаў „сымвалам іх сусьветнай магутнасьці“...

Яшчэ аб манархічным скандале ў Францыі.

З прычыны скандальна сьмешнага вызваленьня з парыжскай турмы павадыра францускіх манархістаў п. Додэ палова францускай прэсы сьмяецца з ураду, палова ж абураецца на парадкі францускай адміністрацыі. Асабліва пікантна, што пасьля свайго „зьні-

---

Але ў кашульнікаў было мала гарматаў і мала ядраў, і самых кашульнікаў было мала. А людзі, што пакінулі Парыж і жылі цяпер у быўшай рэзыдэнцыі каралёў—у Вэрсалі, кожны дзень падвозілі новых салдатаў—сыноў маламожных і маларазумных сялян Францыі — і новыя гарматы, якімі абдорылі іх нягодныя прусакі. Яны ўсё бліжэй і бліжэй падыходзілі да акопаў, што апяразывалі горад Парыж. Ужо шмат фартоў было ў іх руках, і больш ніхто ня прыходзіў на зьмену забітым стральцом, якія разам з Луі-Ру баранілі форт сьв. Вінцэнта. Муляр цяпер сам падкатываў ядры, сам набіваў гармату, сам страляў, і яму памагалі толькі два ацалеўшыя кашульнікі.

У былай рэзыдэнцыі каралёў Францыі панавала вясёласьць. Адчыненыя насьпех кавярні з дошчак не маглі стоўпіць усіх жадаўшых рубінавых настоек. Аббаты ў фіялетавых сутанах адпраўлялі пышныя набажэнствы. Пагладжываючы грозна зьвісаючыя вусы, генаралы весела гутарылі з пад'яжджаючымі прускімі афіцэрамі. І лысыя лякаі ўжо краталіся каля панскіх клункаў, гатуючыся да павароту ў найпрыгажэйшы з усіх гарадоў. Цудоўны парк, пабудаваны на косьцях дваццацёх тысячаў работнікаў, дзень і ноч капаўшых зямлю, пракладаўшых прасекі, асушаўшых балоты, каб не спазьніцца на тэрмін, вызначаны Каралём-Сонцам, — прыбіраўся сьцягамі на знак перамогі. У дзень медныя трубачы надувалі свае шчокі, каменныя трытоны дзевяцёх вялікіх і сарака малых фантанаў лілі крывадушныя сьлёзы, а ўначы, калі ў абяскроўленым Парыжы прыгашаныя агні ня луналі на асьпідзе пляцаў, зухвала зігцелі сярод лісьцяў урачыстывэнзэлі з плошак.

Лейтэнант нацыянальнае арміі Францua д'Эманьян прывёз сваей заручніцы Габрыэлі дэ-Банівэт букет штучных лілеяў, які сьведчыў аб чыстасьці і нявіннасьці яго пачуцьця. Лілеі былі ўстаўлены ў залаты порт букет, аздоблены сапфірамі і куплены ў Вэрсалі ў залатара з вуліцы Міру, які ў першы дзень бунту здолеў вывезьці свае каштоўнасьці. Букет быў падараваны таксама на знак перамогі—Францua д'Эманьян прыехаў на дзень з парыжскага фронту. Ён апавядаў заручніцы, што паўстанцы разьбіты. Заўтра ягоныя жаўнеры возьмуць форт сьв. Вінцэнта і ўвойдуць у Парыж.

— Калі пачнецца сэзон у Опэры?—спыталася Габрыэля.

Пасьля гэтага яны аддаліся любоўнаму шчабятаньню, зусім натуральнаму паміж маладым героем, прыехаўшым з фронту, і заручніцай, вышываўшай дзеля яго атласовы капшук. У мінуту-ж асаблівае пяшчоты, сьціскаючы рукой ўчасьніка труднага паходу станік Габрыэлі, Францua сказаў:

— Мая мілая, тыя ня ведаеш, да чаго жорсткія гэтыя камунары. Я бачыў у бінокль, як ля форту сьв. Вінцэнта маленькі хлопчык страляў з гарматы. І падумай толькі: гэты маленькі Нэрон курыць ужо люльку.

— Але вы мусіць іх усіх заб'еце разам з дзяцьмі?—прашчабятала Габрыэля, і грудзі яе мацней закалыхаліся пад рукою ўчасьніка паходу.

(Канец будзе).

кненьня" п. Додэ ўсьцяж рэгулярна зьмяшчае свае артыкулы ў рэдакаванай ім манархічнай часопісі „Аксіон Франсэз"... Гэта значыць, што ён — вельмі блізка ў краі ці па-за краем, ды стуль кіруе газэтай... Абураны гэтым урад загадаў зрабіць вобыск у рэдакцыі газэты і арыштаваць рэдактара яе. Вобыск выкрыў аж 7 сэкрэтных тэлефонаў у схаваным пакойчыку пры рэдакцыі, праз якія зносіўся п. Додэ з рэдакцыяй...

Апошняя вестка, яшчэ не пацьверджаная, кажа быццам Додэ сядзіць у сталіцы Бэльгіі — Брусэлі.

Колькі грошаў вінна Югаславія Англіі.

Вельмі цяжка йдзе сплата даўгоў — сваім „дабрадзеям"—вялікім дзяржавам тымі новастворанымі малымі дзяржавамі, якія, праўду кажучы, у значнай меры адратавалі „вялікіх" ад разгрому пад ботам Вільгэльма...

Дзяржавы-дабрадзеі, а перадусім Англія, якая найбольш скарыстала з Вялікай вайны, палічылі гэтым новаствораным дзяржавам кожны грош, дый цяпер — рашуча спаганяюць пазыкі. Можна сказаць, што стварэньне такіх мяшаных дзяржаваў, як Югаславія, Чэха-Славакія, Польшча ды інш., якія складаюцца з некалькіх асобных народаў, пры чым адзін зроблены „дзяржаўным гаспадаром", а іншыя недзяржаўнымі, падданымі гэтаму гаспадару,— у значнай меры было зроблена ўмысна, каб лягчэй было спаганяць з гэтых цераз меру павялічаных абшараў пазычаныя азброенымі ліхвярамі грошы...

Каб сплаціць толькі працэнты за гэтыя даўгі адной толькі Англіі, Югаславія павінна амаль-што зусім адмовіцца спажываць унутры краю прадукты сваей сельскай гаспадаркі, прадаючы іх—за ўсялякую цану — за граніцу, ды замяніваючы на добрую валюту,—каб толькі споўніць „абавязак чэсьці ды ўдзячнасьці" перад сваімі „дабрадзеямі". Бо-ж аднаго толькі ваеннага доўгу адной толькі Англіі, Югаславія мае каля 300 мільёнаў залатых рублёў, ня лічучы яшчэ дзесяткоў мільёнаў новых пазык, якімі Англія... памагала Югаславіі „ўпарадкаваць свае фінансы", каб... даць ей магчымасьць плаціць працэнты за англійскія пазыкі... Дык ужо з аднаго таго, што Англія ўсьцяж пазычае Югаславіі новыя грошы, каб тая магла плаціць працэнты, відаць усю тую „нявылазную кабалу", у якую загналі сэрба-харвата-славенскую дзяржаву яе „вялікія дабрадзеі".

Рымскі Папа багаславіў ксяндзоў - паўстанцаў у Мэксіцы.

У сваей апошняй вялікай палітычнай прамове рымскі Папа паміж іншым паслаў сваё асаблівае багаслаўленьне каталіцкім біскупам ды ксяндзам, якія вядуць страшэнную барацьбу з народным урадам у Мэксіцы, бароначы перадусім свае вялізарныя маёнткі.

Як ведама, каталіцкі клір у Мэксіцы зьяўляецца найвялікшым абшарнікам у краі, бо захапіў у працягу сотняў гадоў страшэнны абшар зямлі—шляхам розных „свабодных ахвяраў" ды „запісаў" зямлі на касьцёл, каб маліўся за душы багатых памешчыкаў ды драбнейшых сялян-хлебаробаў... Цяпер урад распачаў вялізарнага размаху зямельную рэформу, дзеля якое адабраў амаль ня ўсю зямлю ад каталіцкага духавенства, якога расплодзілася ў Мэксіцы гэтулькі, як нідзе на зямлі... Урад апрацаваў закон, паводле якога ў краі павінна быць толькі гэтулькі ксяндзоў ды біскупаў, колькі патрэбна насяленьню дзеля адпраўленьня розных царкоўных абрадаў для веручых. Рэшту духавенства, якое, нічога ня робячы, жыве як у запраўдным раі на зямлі, дый ліча датаго-ж сябе звольненым ад усіх падаткаў ды павіннасьцяў на карысьць дзяржавы, урад загадаў выслаць з краю... Тады духавенства пачало яўна і адкрыта бунтавацца проці ўраду —нанімаць цэлыя арміі, арганізоўваць аружныя паўстаньні, карыстаючыся тым, што сабрало ў сваіх кляштарах вялізарныя масы грошаў... Дагэтуль яшчэ ня спынілася гэтая хатняя вайна, паднятая каталіцкім клірам, што бароніць свае маёнткі ад галадаючага беззямельнага ды малазямельнага хлебароба...

Трэба дадаць, што, маючы вялізарныя карысьці з свайго нячуванага, запраўды-ж райскага жыцьця ды аграрнага вызыску працоўнага насяленьня Мэксікі, шматлікае багатае духавенства краю пасылала вялізарныя сумы ў Рым... І вось, гэтыя „сталыя падаткі"—даходы Рымскага Папы з Мексікі—раптам спыніліся... Але—барацьба яшчэ ідзе, і Папа мае надзею на перамогу кліру... Дык пакуль-што — пасылае свае асаблівае „апостальскае багаслаўленьне" „шляхотным барацьбітам касьцёлаў у Мэксіцы" — проці бязбожнага ўраду і г. д...

ХРОНІКА.

Самазванцы. 2-га ліпня некаторыя беларускія ўстановы атрымалі павестку з штампам Беларускага Нацыянальнага Камітэту ў Вільні з датай 29-га чэрвеня с. г. —з запросінамі на агульны сход Камітэту, назначаны быццам 2-га ліпня ў 6-й гадз. увечары ў нейкім памешканьні пры Людвісарскаў вуліцы № 1 кв. 19. На павестцы стаялі гэткія справы: пацьверджаньне мандатаў сяброў, справаздача за мінулы час, выбары прэзыдыуму Камітэту, бягучыя справы. Павестку падпісалі — „за прэзыдыум Камітэту" — паны Ярэміч і Стэповіч.

Подпісы гэтыя—яўна самазванныя: прэзыдыум Камітэту ані ведала аб рассылцы гэтых павестак, ані ўпаўнамочыла паноў Ярэміча і Стэповіча падпісацца за яго. Як відаць, мы маем тутака дзела з новым палітычным машэнствам: пасьля таго, як прысваеньне імя „Беларускага Выбарнага Камітэту", створанага работнікамі, прайшло для хадэкаў і ярэмічаўскіх сельсаюзьнікаў бяскарна, яны, як відаць, наважыліся паўтарыць такую-ж штуку і з Нацыянальным Камітэтам.

Спадзяемся, што гэтым разам машэнства не астанецца бяскарным!

На падобныя „запросіны", ведама-ж, ніводная з беларускіх культурных установаў, якія прадстаўлены ў камітэце, не адгукнулася. Сабраліся толькі „свае" — „армія" кс. Станкевіча. Каго яны ў фальшаваным „камітэце" выбіралі, ня ведаем.

Цікаўна будзе ў гэтым выпадку становішча польскае ўлады, у якой Беларускі Нацыянальны Камітэт (праўдзівы) зарэгістраваны ўжо многа гадоў таксама зарэгістраваны і праўдзівы прэзыдыум К-ту (старшыня гр. Савіцкі, сэкрэтар Марціачык). Ці мо' і тут кс. Станкевіч і Ярэміч дзеюць ў паразуменьні з тэй установай, якая дала ім „манаполію" на прадстаўніцтва „незалежніцтва"?!

Працэс „трынадцацёх". У хуткім часе будзе разглядацца сэсіяй Акружнога Суда ў Ваўкавыску, справа 13-цёх грамадзян, абвінавачаных паводле арт. 102. ч. І. К. К., быццам належалі да Камуністычнай Партыі Заходняй Беларусі, якая мела на мэце адарваньне Заходняе часьці Беларусі ад Польшчы і далучэньне яе да Радавае.

Прозьвішчы абвінавачаных наступныя: Іцко-Ізаак Огульнік, Абрам Грунэс, Міхась Лавік, Міхась Раманчук, Абрам Гарбэр, Калман Шварц, Уладзімер Сегень, Уладзімер Бязносік і Аляксандар Стасевіч—усе з места Ваўкавыска; Аляксей Сявошка і Ціхан Шырковец з вёскі Рачкі, пав. Ваўкавыскага і Васіль Герман і Мікалай Марчук з вёскі Ліхасельцы, пав. Ваўкавыскага.

Акты абвінавачваньня атрымалі ў суботу, 25 чэрвеня 1927 г.

Водгукі віленскіх урачыстасьцяў. Урачыстасьці, на якія зьехаліся ў Вільню Прэзыдэнт, марш. Пілсудскі, міністры ды ўсё каталіцкае вышэйшае духавенства, прайшлі даволі няўдачна з прычыны таго, што ў вызначаны дзеля каранаваньня абраза Вострабрамскае Маці Божае дзень (2 ліпня) ад самае раніцы ішоў вялізарны дождж, які разагнаў людзей так, што асталіся толькі тыя, хто з абавязку павінен быў аставацца на месцы да канца абраду, дый войска і розныя дэпутацыі. Сярод сялянства, якое з некаторых ваколіц краю прыходзіла пехатой, панаваў дужа прыкры настрой: яно было адсунена на задні плян, а некаторыя партыі сялян, як прыкладам тая, што йшла праз Антокаль, былі спынены недаходзячы да месца ўрачыстасьці і варочаліся назад. Чутны былі жальбы, што ўрачыстасьць зроблена для паноў і г. д.

Перад урачыстасьцяй былі пашыраны ў горадзе розныя адумысныя брашуры, адна з якіх—польская—даводзіла, што ўсе славяне... гаварылі па-польску!.. Выданая літвінамі брашура, якая давала нязгоднае з польскімі брашурамі асьвятленьне мінуўшчыны краю, места Вільні і абраза Маці Божае, была сканфіскавана.

Беларусам памятны будзе гэты дзень... новымі арыштамі!

Афіцыяльны курс грошы на 5 ліпня. Далар—8 зл. 89 гр. Залаты рубель — 4 зл. 60 гр.

5./VII. на чорнай біржы ў Вільні за далар плацілі 8,90. Зал. р. 4,70. Чырв. 3 дал. 90 цэн.

Карэспандэнцыі.

Культурная праца.

(Мігаўка, Радашк. вол.).

У апошні час неяк даецца заўважыць вялікае зацікаўленьне беларускай вёскі сваім родным словам. З розных мясцовасьцяў нашае старонкі даходзяць ведамасьці аб наладжаньні спэктакляў, рэфэратаў і т. п. Зьявішча гэта, трэба сказаць, вельмі прыемнае, бо сьведчыць яно аб шыбкім росьце нацыянальнай сьвядомасьці і сьвядомасьці наагул.

Вось-жа і ў нас, у ф. Мігаўцы, з ініцыятывы грам. А. Уласавай, у чацьвер 23 га чэрвеня адбыўся спэктакль-вечарына. Згуляны быў вадэвіль п. н. „Боты" і пасьля яго было прадэклямавана некалькі вершаў, як „Ворагам беларушчыны" — (Я. Купалы), і „Chreśbiny Maciuka"—(Фр. Багушэвіча) і інш. Паміма таго, што ўсё гэта рабілася на скорую руку (бо толькі пры адной рэпэтыцыі!), рэзультат атрымаўся вельмі здавальняючы. Сцэна з'імправізавана самымі-ж артыстамі ў гумне сэнатара Уласава (і ў працягу аднае гадзіны), але рабіла даволі добрае ўражаньне. Артысты, праўда, былі слаба падгатаваныя, аднак пры добрым хаценьні правялі свае ролі жыва і ўмела. Публіка, якая сабралася з усіх акалічных вёсак у вялікім ліку, вынясла, як было відаць, надта добрае ўражаньне. Навет адзін польскі вучыцель, які таксама прышоў пацікавіцца, воказваў пасьля сваё задаваньне. Вечарына закончылася скокамі. Наагул, як на пачатак, усё ўдалося вельмі добра.

І за гэтыя добрыя вынікі перш за ўсё трэба злажыць шчырую падзяку гр. А. Уласавай, якая, паміма ініцыятывы, шмат памагла ў падтрыхтаваньні і будаваньні сцэны, гасьцінна аддала ў загад артыстаў памяшчэньне для скокаў і ўрэшце для ўсіх артыстаў і некаторых з прысутных гасьцей устроіла багаты пачастунак.

Наагул трэба горача прывітаць гэтыя добрыя пачынаньні і спадзявацца, што праца гэта, пры дапамозе з боку сьвядомых грамадзян, у далейшым прыме больш пэўныя і шырэйшыя формы.

Прысутны.

Бура на вёсках Гэрбелявічы, Сычаўляны і Явар.

(Слонімшчына).

12-га чэрвеня ў гадз. 4 папалудні, якраз калі адбываліся выбары па абводах кандыдатаў у самаўрады, прайшла страшэнная навальніца і ўраган, які нарабіў шмат зьнішчэньня. На сваёй дарозе ён не шкадаваў нічога, ніхто ня мог яму супраціўіцца. У лясох дрэвы павырывала з караньнямі, ламала па-палове і каля самага камеля, закідваючы дарогу. Ні прайсьці, ні праехаць каля лесу пасьля буры нельга было.

Вёску Сачыўляны, Дзятлаўскае вол., саўсім разьвярнула. Дарога праз вёску была завернута так, што мусілі ў нядзелю рубаць і прачышчаць, каб прагнаць скаціну. З аднаго дому, як вырвала кубел з сланінаю, так нясло да рэчкі некалькі сажняў. У некаторых мейсцах пазаставаліся толькі зрубы, а стрэхі пазрывала, скруціла і з дзікім гоманам пакідала адныя на другія, закручваючы ўсё саломаю, так і поп з крапідлам мусіць не распазнаў-бы, што дачаго належыць.

У Явары царку сарвала і кінула каля рэчкі.

У Гэрбелявічах, Казлоўскае вол., Слонімскага пав., найбольш пацярпела паўднёва-заходняя старана вёскі. Хваля прайшла найбольш на загуменьні. У некаторых сялян дамы засталіся цэлымі, паабрывала толькі стрэхі, некаторым-жа прыходзіцца жыць прыкрыўшыся небам, або ісьці ў падсуседы. Шмат было новых гумнаў, якія толькі-што яшчэ папакрывалі і ў суботу нат грошы яшчэ аддалі майстрам, саскробваючы апошнія.

А цяпер і не разьбяруцца, што каму належыць. Дый ня толькі адбудаваць трудна: трудна нат' разабраць усё гэта, няма ведама, скуль пачынаць. Некатарыя дамы адкінула з падмуроўкі, і яны пахіліліся на бок. І гэта тады, калі ніхто ня мае ані саломінкі, навет і хлеба няма. А зараз прыдзецца сенаваць, і няведама, куды складаць. Скаціну ставяць у загарады, зробленыя з раскіданага дрэва.

14.VI. зноў закрыла неба чорнымі хмарамі, падняўся вецер, лісьцё закружылася ў паветры і паваліўся град, велечынёю з курынае яйцо. Цьвёрды, шарупаваты, па чверці фунта адзін, у сярэдзіне праслоены, нібы абрастаў памаленьку.

15.VI. праяжджаў заступнік Слонімскага старасты. Спытаўся адно ў солтыса, ці 20 тысяч злотых пазычкі хопе ім на адбудову, пытаючыся пры гэтым, ці шмат маюць поля, ці добрая зямля і пасевы. (У вёсцы больш 100 гаспадароў). Значыць, ці варта яшчэ даць пазычку з процантамі; а нашыя мужычкі спадзяваліся, што атрымаюць страхоўку! Бо навошта ж плацяць? Усёроўна, гэта зроблена з будынкамі ня сумысьля. Да вайны, калі ў нашага абшарніка Гербовіча бура таксама разьвярнула будынкі, ён дастаў страхоўку спаўна.

19.VI. прыяжджаў таксама і ваявода Наваградзкі—сказаў тое самае, што і застэмніца Старасты.

А.

Забойства.

(Слонімскі павет).

8 траўня, на хутары Рэпішчы, каля вёскі Руды-Яварскае, Казлоўскае вол., задушаны Белавус, ды кінуты крывавымі злачынцамі ў стайні. Будынак, які знаходзіўся над аднэю стрэхаю з домам, падпалілі. Як на забойцаў, паказваюць на яго маладую жонку разам з пляменьнікам яго Каракулькам, каторы заўсёды там праседжваў.

Усе хатнія рэчы былі загадзя павыношаны ў гумно, якое стаяла асобна і замкнута, а Белавусіха не хацела даць ключоў паліцыі, якая рабіла вобыск на другі дзень.

Белавусіху арыштавалі і адправілі ў Навагрудак. Ходзяць чуткі, што Каракулька недзе ўкрываецца ў лесе, бо адразу ня быў заарыштаваны.

Арыштаваныя справу гэтак тлумачаць: уначы ў стайні нешта пачало грукаць. Белавус думаў, што крадуць коні, і пайшоў туды, дзе і быў задушаны злодзеямі, якія, каб схаваць канцы, падпалілі будынак.

Людзі, каторыя сабраліся на пажары, не маглі адагнаць сабаку, каторая скакала ў вагонь і вельмі жаласна скавытала; дагадаліся тагды, што там ёсьць і сам гаспадар Белавус. Калі разгарнулі вугальле, то знайшлі косьці цела і галаву, якая абгарэла адно з патыліцы, бо кінулі яго тварам у гной, дзеля гэтага твар застаўся цэлы. Рот быў заткнуты ганучамі.

А.

Весткі з Літвы.

Літоўскі ўрад шчыльна зачыніў граніцу ў часе ўрачыстасьцяў у Вільні.

Як ведама, польскі ўрад, каб даць магчымасьць усім верным каталікам з Літвы быць на ўрачыстасьці „каранацыі" Вострабрамскае іконы Маткі Боскай, адчыніў з свайго боку польска-літоўскую граніцу, ды зрабіў шмат розных палёгкаў багамольцам дзеля прыезду ў Вільню.

Літоўскі ўрад, аднак, бачучы ў гэтай урачыстасьці перадусім палітычны крок, скіраваны да далейшай палянізацыі Вільні, адказаў на адчыненьне граніцы з польскага боку зачыненьнем яе асабліва шчыльна — з літоўскага боку... Насяленьню прыгранічных мясцовасьцяў было строга забаронена перахадзіць граніцу, каб ісьці ў Вільню на ўрачыстасьць; а каб фактычна спыніць усялякую магчымасьць гэтага пераходу, пагранічная варта значна ўсілена прысланымі атрадамі войска і паліцыі... У дні ўрачыстасьці была спынена выдача так-званых „зямляробскіх пропускаў" для сялян дзеля сельска-гаспадарчай працы ў прыгранічным поясе.

Суды аб шпіёнства.

Польскае „Усходняе Агенцтва" паведамляе з абурэньнем аб новых „нячуваных перасьледаваньнях польскай меншасьці ў Літве". „У найбліжэйшых днях мае адбыцца камэдыя судовага працэсу (у даразным судзе) проці 7 палякоў, ілжыва абвінавачаных літоўскай уладай у шпіёнстве на карысьць Польшчы. Усім пагражае кара сьмерці".

„Камэдыя судовага працэсу" у зьвязку — з трагедыямі кары сьмерці! Вельмі трафна сказана... Але ці-ж усё гэта робіцца толькі ў Літве, але ня робіцца на „Усходзе Эўропы" наагул, аб гэтым „Усходняе Агенцтва" маўчыць...

БРАТЫ! НЕ ЗНІШТАЖАЙЦЕ СВАЕ БЕЛАРУСКАЕ ГАЗЭТЫ; ПРАЧЫТАЎШЫ, АДДАЙЦЕ СУСЕДАМ.

Рэдактар-Выдавец: М. Гічан.

Друкарня Я. Левіна, Вільня, Нямецкая 22.